# Месца Гранд-тура ў мадэлі адукацыі магнатаў Вялікага Княства Літоўскага ў другой палове XVII–XVIII стст.

*Калтачэнка А. І., аспірант РІВШ,*
*навук. кір. дац. Любы А. У., канд. гіст. навук, дацэнт*

Мадэль адукацыі магнатаў у другой палове XVII–XVIII стст. складалася з некалькіх этапаў. Пачыналі вучыць дзяцей з сямі лет. Магнацкія роды наймалі выбітных інтэлектуалаў, якія старанна рыхтавалі нашчадкаў да наступнага этапу – школьнага. Школы ці калегіумы выбіралі па розных прыкметах: навучальныя праграмы, настаўнікі, блізкасць да дома і інш. Далейшым этапам адукацыі было падарожжа ў Еўропу. Юнакі выпраўляліся ў свет пасля шаснаццацігодзя. За тыя гады, якія былі адведзены пад еўрапескае падарожжа, яны вывучалі некалькі замежных моў, удасканальвалі веды па гуманітарных навуках, наведвалі рыцарскія школы і набывалі ваенныя веды (ваенная інжынерыя, стратэгія і тактыка бою). Даволі добра апісаў праграму рыцарскіх школ Януш Радзівіл: «Я бачыў як весці аблогу і заваёўваць гарады, як трапіць у ворага зблізку і здалёк, як пракладаць сабе шлях да зачыненых ці таемных мясцін, як змагацці і перамагаць, як змагацца і прайграваць» [1]. Акрамя таго, абавязковым пунктам падчас падарожжа па Еўропе было наведванне і прадстаўленне пры іншаземных кіруючых дварах. Гэта было неабходна для ўмацавання сацыяльнага статусу і прэстыжу, набыцця свецкіх манер і навыкаў дыпламатыі, удасканалення ведаў замежных моў.

Пры гэтым да сярэдзіны XVII ст. былі распаўсюджаны так званыя перэгрынацыі (peregrinatio academica), якія доўжыліся ад двух да чатырох гадоў. Мэтай яе было набыццё ведаў у канкрэтных навучальных установах. У сярэдзіне XVII ст. адбыліся змены ў мадэлі замежнай адукацыі. Была ўведзена новая канцэпцыя – Grand Tour, якая пашырала праграму перэгрынацый і дапаўняла яе турыстычным аспектам [2]. Пры новай мадэлі, пасля выканання асноўнай праграммы навучання ў Еўропе, малады магнат адпраўляўся ў турыстычнае падарожжа, якое доўжылася тры-чатыры гады.

Падобныя працэсы ў XVII ст. адбываліся па ўсёй Еўропе, асабліва ярка гэта выявілася ў англічан, якія вучыліся ў мясцовых універсітэтах, а потым адпраўлялі моладзь у падарожжа па Еўропе, мэтамі якога былі не толькі вывучэнне якіх-небудзь навук, а знаёмства з культурай і традыцыямі іншых краін. У 1670 г. Рычарда Лассельс, які быў настаўнікам англійскіх дваран і мноства разоў суправаджаў маладых людзей у падарожжах па Еўропе, выдаў кнігу, у якой увёў тэрмін Гранд-тур. Менавіта так сталі называць новы від адукацыйных падарожжаў, які уключаў у сябе турыстычны элемент, нягледзячы на тое, што мэты і стаўленне да вандраванняў заставаліся нязменнымі [3].

Маршрут Гранд-тура прадстаўнікоў ВКЛ быў наступным: праз Свяшчэнную Рымскую імперыю, закраная Галандыю і Фландрыю, ехалі ў Францыю, а праз яе ў Італію. Некаторыя магнаты наведвалі Швейцарыю, некаторыя астатнія землі Нідэрландаў, радзей ехалі ў Англію, а некаторыя ў Іспанію. Самымі папулярнымі гарадамі былі Рым, Парыж і Вена.

Добрым прыкладам Гранд-тура прадстаўніка магнатэрыі ВКЛ з'яўляецца падарожжа Караля Станіслава Радзівілла (1669–1719), якое адбылося ў 1684–1687 гг. Першапачаткова Караль Станіслаў навучаўся ў езуіцкім калегіуме ў Любліне, і для ўдасканалення адукацыі выехаў у Еўропу [4]. Маршрут падарожжа быў наступным: Кракаў, Уроцлаў, Берлін, Дрэздэн, Прага, Падуя, Турын, Парыж, Лондан і іншыя гарады Англіі, Іспанскія Нідэрланды, Галандыя, Парыж, падарожжа па Партугаліі і Іспаніі, Парыж, Рым, Неапаль, Вена, Уроцлаў [5].

Падчас вандроўкі Караль Станіслаў пісаў дыярыуш [5], які і паказвае адрозненне Гранд-тура ад папярэдніх падарожжаў. Даволлі шмат увагі ў ім надаецца ўражанням ад архітэктуры, выяўленчага мастацтва, розных цырымоній. У той жа час дыярыуш Юрыя Радзівіла (1556–1600), які ён пісаў падчас падарожжа ў Італію ў 1575 г., з'яўляецца падрабязным пералічэннем маршруту падарожжа і спісам людзей, з якімі адбыліся сустрэчы. Уражанні ад мястэчак, праз якія праязджаў Юрый Радзівіл, апісваюцца вельмі сціпла, фактычна толькі адным словам – прыгожы [6].

Такім чынам, Гранд-тур займаў віднае месца ў мадэлі магнацкай адукацыі ў другой палове XVII–XVIII стст. і значна адрозніваецца ад папярэдніх варыянтаў адукацыйных падарожжаў.

## Літаратура

1. Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie (AGAD). – Archiwum Radziwiłłów. – Dz. IV. – Sygn. 178. – S. 1–2.

2. Kucharski, A. O podróżach edukacyjnych w XVII i XVIII wieku – przypadek Rzewuskich / A. Kucharski, S. Roszak, A. Wieczorek // Społeczne i kulturowe uwarunkowania edukacji w Rzeczypospolitej XVI–XVIII wieku / dr hab. Kazimierz Puchowski. – Warszawa, 2017. – S. 75–97.

3. Lassels R. The Voyage of Italy, Or A Compleat Journey Through Italy: In Two Parts / R. Lassels. – Paris: by John Starkey, 1670. – P. 447.

4. Mikocka-Rachubowa, K. Wrażenia artystyczne Karola Stanisława Radziwiłła z podróży po Europie (1684–1687) / K. Mikocka-Rachubowa // Miscellanea Historico-Archivistica. Radziwiłłowie XVI–XVIII wieku: w kręgu polityki i kultury / K. Mikocka-Rachubowa. – Warszawa, 1989. – T. 3. – S. 235–250.

5. AGAD. Archiwum Radziwiłłów. – Dz. IV. – T. 19. – Kop. 239.

6. Modlińska-Piekarz, A. Tłumaczenie i opracowanie tekstu łacińskiego. Dziennik podróży do Włoch Jerzego Radziwiłła w 1575 roku / A. Modlińska-Piekarz // Kultura i Historia. – 2012. – № 21. – S. 63–83.